ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1987
12
лістапада
чацвер

№ 30(1551)

## Беларускі універсітэт ТЭЛЕТАЙП
*ЎЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА*

### НА ПАСЯДЖЭННІ

савета БДУ імя У. І. Леніна заслухана справаздача прарэктара па АГЧ У. І. Тарасевіча аб падрыхтоўцы універсітэта да работы ў зімовых умовах. Прарэктар па навуковай рабоце прафесар С. С. Шушкевіч паведаміў аб перабудове планавання і правядзення гаспадарча-дагаворных навукова-даследчых работ.

Разгледжаны таксама арганізацыйныя пытанні.

Ч. ВІКТАРАЎ.

### «МІЖНАРОДНІК»

— так называецца дыскусійны клуб замежных і савецкіх студэнтаў пры кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў. На сваіх пасяджэннях члены клуба абмяркоўваюць хвалюючыя іх праблемы, узнімаюць надзённыя пытанні. Тэма апошняй гутаркі — «Вялікі Кастрычнік і сусветны рэвалюцыйны працэс». З паведамленнямі выступілі аспірант Дмала Усман Уора (Гвінея), студэнт фізічнага факультэта Шахут Айяд Муфтах (Лівія), дацэнт Р. А. Малюковіч.

ЧАРЫНЕТ ГЕБРЭ СЕНБЕТ,
прэзідэнт клуба.
студэнт хімічнага факультэта.

### ВЯРНУЎСЯ З ПАЕЗДКІ

ў Ісландыю народны ансамбль танца «Крыжачок», дзе ён прадстаўляў наша нацыянальнае мастацтва на Днях культуры СССР на прыкладзе Беларускай ССР .

Адкрыццё фестывалю адбылося ў г. Сельфасе. Акрамя вялікіх канцэртаў у гарадах, майстэрства «Крыжачка» маглі ацаніць і жыхары сельскай мясцовасці.

За час гастроляў удзельнікі ансамбля пабывалі на прыёмах у прэзідэнта Ісландыі, у Міністэрстве культуры і вышэйшай адукацыі краіны, у пасольстве Савецкага Саюза ў Ісландыі. Сардэчнай і цёплай была сустрэча з сусветна вядомым пісьменнікам, кнігі якога перакладзены на рускую мову, лаўрэатам Нобелеўскай прэміі Лакснесам.

У. МАКАРЭВІЧ.

### ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ

агляду-конкурсу спартыўна-масавай работы за мінулы год. Пасля падліку балаў месцы размеркаваліся наступным чынам: першае — юрфак, другое — фізфак, трэцяе — факультэт радыёфізікі і электронікі.

А. МАКСІМАЎ.

## УСЕСАЮЗНЫЯ ДНІ ФІЗІКА

**Трэція Усесаюзныя дні фізіка пройдуць у Мінску з 17 па 22 лістапада. Вестка пра гэта была з захапленнем і ўздымам сустрэта ў дэканаце і камітэце камсамола фізічнага факультэта.**

# Засталося зусім нямнога



ШТО ТАКОЕ УДФ? Першыя Усесаюзныя прымаў Ерэван, УДФ-2 — Масква. А сёлета гэта пачэсная місія выпала Белдзяржуніверсітэту. Якім быць святу?

Мінскі абком камсамола, гарадскі студэнцкі клуб, Усесаюзны аргкамітэт ДФ жадаюць прыцягнуць да ўдзелу ў УДФ-3 студэнтаў не толькі БДУ, але і БПІ, МРТІ, БДІНГ і правесці УДФ-3 як гарадское студэнцкае свята. Мэта Усесаюзных дзён фізіка — гэта ў першую чаргу вольныя сустрэчы, гутаркі, зближэнне маладых фізікаў усёй краіны. Кантакты, наладжаныя ў Ерэване і Даўгапрудным, ужо дапамагаюць у рабоце многім удзельнікам УДФ. А яшчэ — дапамога маладым студэнцкім тэатрам мініяцюр, абмен вопытам у творчых лабараторыях. Магчыма, да Усесаюзных дзён фізіка будзе, нарэшце, прыцягнута ўвага ўсіх камсамольскіх органаў як да «творчай ініцыятывы студэнтаў».

УДФ-3 пачнуцца 17 лістапада мітынгам. Як вядома, прабацькам ДФ быў Дзень Архімеда, які праводзіўся ў Маскоўскім дзяржаўным універсітэце ў сярэдзіне 60-х гадоў. Трэба адзначыць, што Дзень Архімеда карыстаўся папулярнасцю і прэстыжам. Яго ўдзельнікамі былі Ландау і Бор (!).

Трэція Усесаюзныя адкрые рэктар Белдзяржуніверсітэта акадэмік Л. І. Кісялеўскі. А працягнецца першы дзень канцэртам-прадстаўленнем дэлегацый і конкурсам «Міс Фізіка».

Колькасць гасцей УДФ-3 — 150. Гэта — 22 дэлегацыі з 18 гарадоў краіны. За няпоўны тыдзень будзе дадзена 8 канцэртаў у залах БДУ, БПІ, МРТІ, БДІНГ і ПК Белсаўпрофа. Гледачы таксама змогуць пагутарыць з дэлегацыямі на прэс-канферэнцыі, пабываць на канцэрце «Песні фізікаў», прыняць непасрэдны ўдзел у своеасаблівым рынзе з гасцямі. А госці ўбачаць канцэрт лепшых творчых студэнцкіх калектываў Мінска. Кафэ «Гаўдэамус» кожны вечар будзе працаваць як творчая лабараторыя. Фіналам з'явіцца гала-канцэрт у ПК МАЗа.

Успомнім А. Бендэра: «Поўную гарантыю можа даць толькі страхавы поліс». Але і ён не можа даць гарантыю таго, што некаму ўдасца ўбачыць усю праграму УДФ-3, бо канцэртаў шмат, а жадаючых яшчэ больш. Дарэчы, тых, хто хоча дапамагчы ў падрыхтоўцы і правядзенні свята, чакаюць у камітэце камсамола фізфака!

Увага! Аргкамітэт аб'яўляе універсітэцкі конкурс на эмблему УДФ-3. Пяць аўтараў лепшых работ будуць прэміраваны білетамі на канцэрты, а пераможцу чакае прыз. Спяшайцеся перамагчы!

А. МУКАВОЗЧЫК,
старшыня аргкамітэта
УДФ-3.

**АДБЫЎСЯ ЎРАЧЫСТЫ ВЕЧАР У ГОНАР ВЕТЭРАНАЎ КАФЕДРАЎ ЗАМЕЖНЫХ МОЎ, ПРЫСВЕЧАНЫ 70-ГОДДЗЮ ВЯЛІКАЙ КАСТРЫЧНІЦКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ.**

## НАШЫ ТРАДЫЦЫІ

# Вечар памяці

Вечар пачаўся канцэртам мастацкай самадзейнасці хору выкладчыкаў універсітэта. Прагучаўшыя ў выкананні калектыву рускія, беларускія, украінскія народныя песні не пакінулі абыякавымі нікога.

Пасля канцэрта было арганізавана дружалюбнае чаяванне. За шклянкай чаю паліліся ўспаміны, расказы ветэранаў пра былую работу. Тут жа быў і абмен вопытам, даваліся парады маладым выкладчыкам. А ўспомніць было што! Работа ў той пасляваенны, цяжкі для краіны час патрабавала высокай маральнай адказнасці. І выкладчыкі з гонарам неслі яе. Больш за 40 гадоў прапрацавалі на кафедры англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў Яфімія Якаўлеўна Шлапакова. Лія Мікалаеўна Барысава, Дзея Дзмітрыеўна Рагозіна, Ганна Вікенцьеўна Янушкевіч, Тамара Емяльянаўна Сугак. Больш 30 гадоў аддаў кафедры французскай мовы адзін з першых яе кіраўнікоў Мікалай Міхайлавіч Полазаў. Звыш 40 гадоў выкладала нямецкую мову Рэгіна Іосіфаўна Варатніцкая, больш 25 — Ганна Адамаўна Савіцкая.

— Правядзенне такіх вечароў,— расказала выконваючая абавязкі загадчыцы кафедры англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў Ала Іванаўна Даўгарукава,— ужо традыцыя ў нас. Кафедры падтрымліваюць пастаянныя дружалюбныя кантакты з выкладчыкамі, якія пайшлі на заслужаны адпачынак. Часта ветэраны прымаюць актыўны ўдзел у правядзенні розных мерапрыемстваў, дзеляцца вопытам з маладымі калегамі.

Лічу, што гэта традыцыя вельмі добрая, карысная і, зразумела, яе трэба развіваць.

В. МІНКОЎ.

## ФОТА-РЭПАРТАЖ

ДУША ФАКУЛЬТЭТА,— так сказалі пра Валю Каспяровіч на геафаку. На чым грунтуецца такая адназначная ацэнка яе адначасова і студэнтамі, і выкладчыкамі?

Валя хвіліну думае над пытаннем. На трэцім паверсе ў гэты час гучыць музыка — дыскатэка ў поўным разгары. Толькі што скончыўся конкурс мастацкай самадзейнасці, які быў арганізаваны камітэтам камсамола, а значыць і ёю — адказнай за культурна-масавую работу.

— Ведаеце,— Валя перарывае маўчанне,— цяпер усе людзі нейкія закамплексаваныя. Ніхто не хоча нічога рабіць, нікуды, як кажуць, лезці. Таму патрэбен нейкі рухавічок, які б скрануў усіх з месца. Іменна ў мяне ніякіх талентаў няма, я і не спяваю, і не танцую. Але ёсць жаданне, цікаўнасць да гэтай справы, таму я і абрала ролю такога рухавічка. Вось гэты ж самы конкурс — галоўнае было заінтрыгаваць першакурснікаў, напомніць ім пра традыцыі, пра гонар факультэта — і яны загарэліся.

(Заканчэнне на 4-й стар.).



## ПЕРАБУДОВА І МЫ

# 70 + 30 = 100% спецыяліст

АДНОЙЧЫ адбылася такая размова. Вынікі яна мела даволі нечаканыя, цікавыя і значныя.

Ішло звычайнае, ужо стаўшае звыклым для абодвух зацікаўленых бакоў, заключэнне гасдагавору паміж БДУ і ВА «Інтэграл». Раптам прагучала пытанне. Цяпер ужо цяжка сказаць, чым кіраваўся той, хто яго задаў: ці то славалюбівым жаданнем пачуць у свой адрас кампліментт, ці то высакародным духам тайнага спаборніцтва, а можа проста зацягнулася паўза і трэба было яе неяк ліквідаваць.

— А чые студэнты: ФПМ ці нашы, мехматаўцы, «Інтэгралу» падыходзяць больш, у сэнсе, як спецыялісты?

— А нічые.

Можна толькі ўявіць, якое здзіўленне адлюстравалася на тварах прафесара кафедры тэарэтычнай механікі і робататэхнікі І. А. Прусава, дацэнта кафедры тэорыі функцый Ф. В. Чумакова і дацэнта кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў М. В. Кажэра, калі яны пачулі такі збіваючы з панталыку адказ. Вучоныя людзі патрабавалі неадкладнага тлумачэння.

— Разумееце, «Інтэгралу» неабходны не проста «голы» матэматык, не важна, чый ён выпускнік — ФПМ ці мехмата, бо яго ж потым давучваць і перавучваць НАМ. А патрэбны матэматык працэнтаў гэтак на 70 і на 30 — электроншчык.

Так, лаканічна. Але па сутнасці. Электроніка, а дакладней мікраэлектроніка як раздзел, вывучае метады стварэння мікрамініяцюрных элементаў з мэтай выкарыстання іх у электронных прыстасаваннях мінімальных памераў. Адзін з асноўных напрамкаў мікраэлектронікі — інтэгральная мікраэлектроніка, яна будуецца на прынцыпе інтэграцыі як у саміх прыстасаваннях, так і ў тэхналогіі іх вытворчасці. Каб стварыць інтэгральную схему, неабходны спецыяльныя прылады праектавання схем. У сваю чаргу нельга тут абысціся без вылічальнай тэхнікі. Вось і атрымліваецца на справе, што вельмі патрэбны матэматык з электронным ухілам.

(Заканчэнне на 3-й стар.).

# Самакіраванню БЫЦЬ!

# «Аб першачарговых мерах па расшырэнню ўдзелу студэнтаў у кіраванні вышэйшымі навучальнымі ўстановамі»

ВА ЎМОВАХ паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця і дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця савецкага грамадства стаіць задача павышэння ролі студэнцкіх прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый вышэйшых навучальных устаноў у рэалізацыі «Асноўных напрамкаў перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў краіне».

З гэтай мэтай у чэрвені 1987 года Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР, Сакратарыятам ВЦСПС і Сакратарыятам ЦК ВЛКСМ прынята пастанова «Аб першачарговых мерах па расшырэнню ўдзелу студэнтаў у кіраванні вышэйшымі навучальнымі ўстановамі». Каб пазнаёміць студэнтаў з вышэйназванай пастановай мы друкуем яе у пераказе.

Кіруючыся рашэннямі XXVII з'езда КПСС і студзеньскага (1987 г.) Пленума ЦК КПСС і прымаючы да ўвагі прапановы, выказаныя на XVIII з'ездзе прафсаюзаў СССР і XX з'ездзе ВЛКСМ, Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР, Сакратарыят ВЦСПС і Сакратарыят ЦК ВЛКСМ пастанаўляюць: рэктарам вышэйшых навучальных устаноў увесці ў састаў вучоных саветаў ВНУ і факультэтаў прадстаўнікоў студэнцкіх калектываў;

— устанавіць, што колькасць студэнтаў у саставе савета павінна складаць не менш чвэрці яго, вылучэнне прадстаўнікоў у састаў саветаў праводзіць на прафсаюзна-камсамольскіх сходах (сходах прафсаюзна-камсамольскага актыву) ВНУ, факультэтаў і курсаў;

— пры выбарах рэктара і дэканаў уводзіць у састаў расшыранага вучонага савета ВНУ і факультэтаў прадстаўнікоў студэнцкай прафсаюзнай і камсамольскай арганізацый у колькасці не больш трэці яго саставу;

— расшырыць прадстаўніцтва і ўдзел студэнцкіх прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый навучальных устаноў у рабоце прыёмных і стыпендыяльных камісій;

— пры ўтварэнні камісій для атэстацыі студэнтаў прадугледзець прадстаўніцтва ў іх студэнцкіх прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый;

— дазволіць прадстаўнікам выбарнага актыву студэнцкіх грамадскіх арганізацый, старастам груп прысутнічаць на заліках, экзаменах, абаронах курсавых і дыпломных работ (праектаў) і ўносіць прапановы па ўдасканаленню практыкі іх правядзення;

— прадугледзець удзел у рабоце камісій па размеркаванню маладых спецыялістаў прадстаўнікоў студэнцкіх грамадскіх арганізацый; даць ім права ўносіць прапановы па фарміраванню плана размеркавання, улічваць думку калектыву студэнцкай групы пры накіраванні маладых спецыялістаў на канкрэтныя месцы работы;

— па рашэнню студэнцкіх прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый пераводзіць студэнцкія інтэрнаты на частковае ці поўнае самакіраванне, якое забяспечвае актыўны ўдзел студэнтаў у вырашэнні пытанняў грамадска-карыснай працы ў пазавучэбны час, быту і адпачынку, арганізацыі культурна-масавых і спартыўна-аздараўленчых мерапрыемстваў. Прадугледзець абавязковае ўзгадненне са студэнцкімі саветамі інтэрнатаў кандыдатур персаналу, які прымаецца на работу, і справаздачы на пасяджэннях студсавета штатных работнікаў інтэрнатаў аб праведзенай рабоце;

— назначаць стыпендыі па рашэнню стыпендыяльных камісій факультэтаў, пры гэтым студэнтам, якія маюць выдатныя і добрыя адзнакі, і тым, хто здаў сесію на «здавальняюча», па прадстаўленню калектываў студэнцкіх груп надбаўкі да стыпендыі з фонду матэрыяльнай дапамогі і заахвочвання размяркоўваць з разліку: 4 працэнты гэтага фонду пры назначэнні стыпендый за асаблівыя поспехі ў вучобе, грамадскай і навуковай рабоце — па прадстаўленню студэнцкіх груп і грамадскіх арганізацый, 1 працэнт — для тэрміновай матэрыяльнай дапамогі — па прадстаўленню адміністрацыі і са згоды студэнцкага прафсаюзнага і камсамольскага камітэтаў.

У пастанове звернута таксама ўвага на неабходнасць адміністрацыі ВНУ даваць адказы на запыты студэнцкага прафсаюзнага і камсамольскага камітэтаў, студэнцкай групы, сходу студэнтаў курса ці факультэта па пытаннях, якія патрабуюць дадатковага вывучэння, інфармаваць іх за дзесяць дзён.

Адзначана, што дэканам факультэта сумесна з грамадскімі арганізацыямі вышэйшых навучальных устаноў патрэбна рэгулярна праводзіць на факультэтах і курсах агульныя сходы студэнтаў і прафесарска-выкладчыцкага саставу, на якіх абмяркоўваць меры па ўдасканаленню вучэбна-выхаваўчага працэсу, у тым ліку прапановы па ўвядзенню вольнага наведвання лекцый на курсах і факультэтах у цэлым, якасць выкладання і вучобы студэнтаў, аганізацыі быту і вольнага часу, заслухоўваць справаздачы службовых асоб і выкладчыкаў на запыты грамадскіх арганізацый, інфармацыю аб прымаемых па гэтых запытах мерах, заслухоўваць справаздачы прадстаўнікоў студэнцкіх калектываў у органах кіравання, экзаменацыйных камісіях і камісіях па размеркаванню маладых спецыялістаў, а таксама студэнтаў — членаў вучоных саветаў ВНУ і факультэтаў аб іх рабоце і выкананні студэнцкіх наказаў.

Прадстаўнікі студэнцкіх калектываў, якія не выконваюць ускладзеныя на іх функцыі, па рашэнню студэнцкіх прафсаюзна-камсамольскіх сходаў (сходаў актыву) могуць быць адкліканы з саставу вучоных саветаў і іншых органаў кіравання.

Для сістэматычнага вывучэння думкі студэнтаў аб якасці выкладання вучэбных дысцыплін праводзіць сіламі дэканатаў і прадстаўнікоў студэнцкіх грамадскіх арганізацый штогадовае анкетаванне студэнтаў па распрацаванай МінВНУ СССР методыцы. Вынікі гэтага анкетавання даводзіць да ведама выкладчыкаў, а атэстацыйных камісій і вучоных саветаў — пры правядзенні атэстацыі выкладчыкаў і выбрання па конкурсу.

У дадзенай пастанове вызначаны і функцыі камітэтаў камсамола і студэнцкіх прафсаюзных камітэтаў ВНУ. У прыватнасці гаворыцца, што важнейшы абавязак членаў камсамольскай і прафсаюзнай арганізацый — усямернае павышэнне якасці іх вучэбнай работы. Камітэты камсамола і прафкомы студэнтаў павінны садзейнічаць стварэнню ў вышэйшых навучальных установах студэнцкіх навукова-даследчых лабараторый, канструктарскіх бюро і іншых прафесійных і творчых аб'яднанняў на аснове студэнцкага самакіравання, а таксама гаспадарча-разліковых студэнцкіх арганізацый па аказанню платных паслуг насельніцтву; пашыраць арганізацыю ў рамках студэнцкіх атрадаў студэнцкіх вытворчых атрадаў для работы ў летні перыяд на прадпрыемствах і ў арганізацыях народнай гаспадаркі па профілю будучай спецыяльнасці.

Калектывам студэнцкіх груп прадстаўляецца права:

— выбіраць стараст, прымаць рашэнні аб вызваленні іх ад абавязкаў і хадайнічаць перад дэканатам аб зацвярджэнні прынятага студэнцкім калектывам групы рашэння;

— уносіць прапановы і рабіць запыты ў органы адміністрацыі і грамадскія арганізацыі па ўсіх пытаннях жыццядзейнасці вучэбнай групы;

— вылучаць кандыдатаў на прысваенне імянных і персанальных стыпендый савета ВНУ;

— хадайнічаць перад стыпендыяльнай камісіяй аб прызначэнні стыпендый членам вучэбнай групы, якія маюць здавальняючыя адзнакі, а таксама аб прызначэнні надбаўкі да стыпендыі за актыўны ўдзел у грамадска-карыснай дзейнасці і яе пазбаўленні;

— прадстаўляць у рэктарат (дэканат) матываваную думку калектыву вучэбнай групы па пытаннях заахвочвання ці пакарання студэнтаў груп, адлічэння іх з ВНУ па прычынах, не звязаных з непаспяховасцю, ці аднаўлення у ёй, а таксама па пытаннях адбору студэнтаў для паглыбленай прафесійнай падрыхтоўкі, выдачы характарыстык і рэкамендацый для навучання ў аспірантуры (ардынатуры);

— уносіць прапановы ў прафком і студсавет аб размеркаванні месц у інтэрнатах і размяшчэнні ў ім членаў вучэбнай групы.



ПАСКАРЭННЕ сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны мае на ўвазе ўзрастанне патрабаванняў да падрыхтоўкі высокакваліфікаваных, гарманічна развітых і грамадска-актыўных спецыялістаў, здольных кампетэнтна і стала вырашаць народнагаспадарчыя задачы. Адной з умоў рэалізацыі перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі з'яўляецца развіццё ў вышэйшых навучальных установах студэнцкага самакіравання, якое выступае актыўнай формай праяўлення дэмакратызацыі савецкай сістэмы навучання. Дамагчыся гэтага можна на аснове грунтоўнага пашырэння правоў студэнцкіх калектываў у галіне арганізацыі навучальнага працэсу, навукова-даследчай работы, прадукцыйнай працы, быту і вольнага часу, адначасова падымаючы іх адказнасць за рэзультаты навучання і грамадскай дзейнасці.

# ПАЛАЖЭННЕ
## аб студэнцкім самакіраванні ў БДУ імя У. І. Леніна

1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1. Студэнцкі калектыў універсітэта — аб'яднанне ўсіх студэнтаў, перад членамі якога стаіць задача ў дасканаласці авалодаць выбранай спецыяльнасцю, глыбока засвоіць асновы марксісцка-ленінскага вучэння, набыць навыкі арганізатарскай, выхаваўчай і прапагандысцкай работы.

1.2. У саставе студэнцкага калектыву універсітэта дзейнічаюць студэнцкія калектывы факультэтаў, кафедраў, акадэмічных груп. Ва універсітэце дзейнічаюць і іншыя студэнцкія калектывы — навуковыя, у інтэрнатах, у сферы арганізацыі вольнага часу, прадукцыйнай працы і г. д.

2. ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ СТУДЭНЦКІХ КАЛЕКТЫВАЎ.

2.1. Студэнцкі калектыў абавязаны канцэнтраваць сваю работу на галоўнай справе — вучобе, ствараць усе ўмовы для авалодання ведамі, выхавання ў студэнтаў адказнасці за рэзультаты сваёй працы, стварэння атмасферы спаборніцтва ў вучобе.

2.2. Студэнцкія калектывы абавязаны:

— садзейнічаць ідэйна-маральнаму, грамадзянскаму станаўленню будучых спецыялістаў, фарміраванню ў іх актыўнай жыццёвай пазіцыі;

— выхоўваць у студэнтаў пачуццё прыналежнасці да ўдасканалення сацыялістычнага грамадства;

— замацоўваць у студэнцкім асяроддзі высокамаральны, культурны, здаровы, цвярозы лад жыцця;

— выхоўваць у студэнтаў беражлівыя адносіны да сацыялістычнай маёмасці, павагу да законаў, нормаў камуністычнай маралі;

— весці наступальную барацьбу з негатыўнымі праявамі буржуазнай ідэалогіі і культуры;

— ствараць нецярпімыя ўмовы для правапарушальнікаў, парушальнікаў дысцыпліны, слабапаспяваючых. Прынцыпова і строга патрабаваць са студэнта за ўсе яго ўчынкі.

2.3. Адказнасць за становішча спраў у студэнцкім калектыве нясе камсамольска-прафсаюзны актыў калектыву, старасты, персанальную адказнасць за даручаны ўчастак работы — кожны камсамолец.

2.4. Студэнцкія калектывы сумесна з адміністрацыяй прымаюць рашэнні па наступных пытаннях, якія закранаюць інтарэсы студэнтаў:

— арганізацыі вучэбнага працэсу, удасканалення форм правядзення заняткаў, самастойнай работы;

— навукова-даследчай работы студэнтаў;

— дзейнасці студэнцкіх атрадаў;

— арганізацыі быту, вольнага часу, адпачынку студэнтаў, пераводу інтэрнатаў на самакіраванне;

— размеркавання бюджэту універсітэта па артыкулах, якія датычаць жыцця студэнцтва;

— заахвочвання студэнтаў і вынясення ім спагнанняў;

— аказання матэрыяльнай дапамогі, размеркавання пуцёвак і іншых ільгот;

— прызначэння (пазбаўлення) стыпендый праз студэнцкія стыпендыяльныя камісіі, вылучэння кандыдатаў на прысваенне імянных стыпендый;

— прадстаўлення ў дзяржаўную камісію па размеркаванню выпускнікоў чарговасці з улікам рэзультатаў вучобы, грамадскай актыўнасці, маральных якасцей;

— рэкамендацыі выпускнікоў для вучобы ў аспірантуры;

— рэкамендацыі сваіх прадстаўнікоў у састаў вучонага савета, конкурснай і метадычнай камісіі універсітэта і факультэтаў;

— дазволу лепшым студэнтам калектыву займацца па індывідуальнаму плану;

— размеркавання месц у інтэрнатах;

— выбрання рэктара універсітэта, дэканаў факультэтаў у адпаведнасці з устаноўленым парадкам;

— складання графіка экзаменацыйнай сесіі і змен раскладу заняткаў;

— дазволу на пераздачу экзаменаў;

— падбору і расстаноўкі адміністрацыйна-гаспадарчага персаналу ў інтэрнатах;

— правядзення сумесных сходаў студэнтаў і прафесарска-выкладчыцкага саставу ў выпадку неабходнасці;

— удзелу ў распрацоўцы планаў ідэйна-выхаваўчай работы ва універсітэце і на факультэтах;

— вызвалення студэнтаў ад заняткаў у выключных выпадках па заяве;

— выбрання старастаў, вызвалення іх ад абавязкаў;

— вывучэння і абагульнення прапаноў студэнтаў па пытаннях паляпшэння арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу, якасці выкладання з абмеркаваннем іх вынікаў на вучоных саветах, конкурсных і метадычных камісіях факультэтаў;

— арганізацыі агляду-конкурсу вучэбных груп на аснове прынцыпу калектыўнай адказнасці, сумесна з дэканатам дыферэнцыравана размяркоўваць стыпендыяльны фонд паміж групамі з улікам вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва і выканання ўзятых калектыўных абавязацельстваў, праводзіцца за кошт чатырох працэнтаў стыпендыяльнага фонду;

— заслухоўвання справаздач адміністрацыі універсітэта, факультэтаў аб выкананні рашэнняў, прынятых па прапанове студэнцкіх калектываў і іх органаў;

— вылучэння кандыдатур у састаў дэлегацый для абмену з іншымі ВНУ СССР і замежных краін.

3. АРГАНІЗАЦЫЙНЫЯ ПЫТАННІ.

3.1. Агульнае кіраўніцтва сістэмай студэнцкага самакіравання ў БДУ імя У. І. Леніна ажыццяўляе камітэт ВЛКСМ і прафсаюзны камітэт студэнтаў. Гэтыя ж арганізацыі нясуць адказнасць за стан спраў і рэалізацыю прынятых рашэнняў.

Студэнцкія калектывы рэалізуюць дадзеныя ім правы непасрэдна на сходах студэнцкіх калектываў (сходах прадстаўнікоў). У перыяд паміж сходамі паўнамоцтвы студэнцкіх калектываў ажыццяўляюцца праз камітэт камсамола і прафком студэнтаў універсітэта, камітэт камсамола і прафбюро факультэтаў.

3.2. Палажэнне аб студэнцкім самакіраванні ў Белдзяржуніверсітэце і змены ў ім выносяцца на абмеркаванне на сходах студэнцкіх калектываў і зацвярджаюцца на сумесным адкрытым сходзе актыву студэнтаў і рэктарата.

3.3. Палажэнне аб студэнцкім самакіраванні дзейнічае ў калектывах па рашэнню сходаў гэтых калектываў.

**ТУРЫСЦКІМІ СЦЕЖКАМІ**

# ПАРАДЫ НАВІЧКУ

БЫВАЛЫ ТУРЫСТ... А чым вымяраецца гэтае «бываласць»? Для пешаходнікаў у першую чаргу — гарамі, бо колькі б вы ні хадзілі па нашых беларускіх сцежках, вам, напэўна, не ўдасца выканаць нават другі спартыўны разрад па турызму.

Ці доўга ў гарах мы бываем? Без году тыдзень. І ўсё ж нас называюць бывалымі. На маім рахунку тры падарожжы трэцяй катэгорыі, пяць — чацвёртай, тры — пятай. З такім вопытам, вядома, штосьці магу падказаць навічку.

Нярэдка пад рубрыкай «Парады бывалых» даюць самае звычайнае, тое, што ў любой кніжцы можна прачытаць. Усё тут абсалютна правільна, акрамя аднаго: замест вопытных турыстаў парады даюць бывалыя плагіятары. Пад гэтай рубрыкай трэба расказваць пра тое, што сам вынайшаў і правeрыў на практыцы. Але такія парады бывалых не спяшайцеся бяздумна прымяняць у сваіх паходах. Раскажу пра адзін выпадак.

Я ўжо гадоў дзесяць нашу сваю вопратку і спальнік, бо яны самыя лёгкія і цёплыя. Праверыў зімой на Кольскім паўвостраве. Пры марозе дзесяць градусаў зусім добра было, пры дваццаці — халаднавата. Калі ж зрабіць якую пячору ў снезе, дык і пры трыццаці не прападзеш. І вось неяк вясной у Беларусі адзін турыст вырашыў карыстацца маім спальнікам. Было ўжо даволі цёпла, снег растаў, а ён да раніцы ледзь не адубеў. Чаму? У маёй вопратцы няма ні ваты, ні ваціну, ні пуху, ні пер'я, ні шэрсці. А што мяне грэе? Паветра, якое заўсёды ёсць паміж адзёжкамі. А яно найлепшы ўцяпліцель. Дарэчы, і вату, і пух, і пер'е запіхваюць у адзёжу іменна для таго, каб не зліпнуліся слаі матэрыі. А як жа мая адзёжа без напаўніцеля? Дык у мяне ж вопратка з пяці слаёў! Ніколі яны ўсе разам поўнасцю не зліпнуцца. Трэба яшчэ дадаць, што вопратку шыў сам, хаця і не вельмі ўмею. А тут якраз няўмелае шыццё і лепш: калі ўнутраныя слаі пашыты коса-крыва, дык яны даюць мноства складак, і матэрыя не будзе зліпацца. Такім жа манерам і спальнік пашыты. Лепшага мне і не трэба. А чаму ж той турыст усю ноч зубамі ляскаў? Што ён зрабіў? Нічога разумнага. Спальнік ляжаў у рукзаку. Скручаны, сціснуты. А трэба ж было яго ўзбіць, успеніць. А турыст, зразумела, гэтага не ведаў.

Пасля таго выпадку я ўжо нікому нічога не раю, а толькі гавару: раблю вось так, а вы як хочаце.

Што яшчэ раблю не так, як другія? Часам хаджу ў паход у адзіночку і тады не бяру ніякай аптэчкі. Сказаць вам, што можна без яе абысціся — гэта ж крамола! Так, для турыста-навічка паход без аптэчкі — проста самагубства. Для паходу па Карпатах далі нам аптэчку кілаграмы на два. Колькі таблетак! А ёду — быццам мы збіраліся на Кулікоўскую бітву! І ўсё зрасходавалі, вось дзіва.

А як бывалы турыст абыходзіцца без аптэчкі? Для яго аптэка — на кожным кроку. Забалела галава — можна ліст падбелу да лба прыкласці, або проста пажаваць кару вярбы (з яе і быў упершыню атрыманы аспірын).

Калі ўжо гаворка зайшла пра лекавыя травы, скажу і такое: можна ўжываць у ежу і невядомыя расліны. Гэта я для сябе зрабіў такі вывад. У нас ёсць трава расходнік едкі. Ядавітая трава. Але ёсць і віды расходніка, якія можна есці. На Алтаі я знайшоў нейкі незнаёмы від і рашыў, што ён таксама ядомы. І не памыліўся. З лісця зварыў боршч, а на кветках чай настояў. Добрая вячэра атрымалася. Потым я даведаўся, што гэта быў расходнік Эверса. Сярод ядомых раслін ён нідзе не ўпамінаецца. Пра якасці той ці іншай расліны можна многа меркаваць, калі ведаць, да якога сямейства яна належыць. Так, напрыклад, сярод губакветкавых, мальвавых няма такіх злосных траў, як сярод люцікавых. Са мной неадночы здаралася так: бачу, што расліна з сямейства губакветкавых, а дакладна, што за яна — не ведаю. А пах — прыемны. Бяру і заварваю чай. Але ўсякі раз, хоць і пасля, стараюся вызначыць, што за расліна мяне выручыла.

Як бачыце, расліны я асвоіў яшчэ не так добра, каб адразу кожную апазнаць. Але ўжо ведаю, што магу ўжываць у ежу нават тыя, якія не ведаю.

І яшчэ. У горы зусім неабавязкова браць паліва. Асабіста я лёгка абыходзіўся па некалькі дзён аднымі сухарамі са снегам або вадой. У пачынаючых турыстаў, напэўна, страўнікі больш далікатныя. Ну, дык цягайце каністры з бензінам ды керагазы! А я і без паліва згатую што-небудзь. І добрыя кашы ў мяне атрымоўваюцца. Як яно варыцца без паліва? Сам не ведаю, але ж варыцца. Нальеш вады, засыплеш сумесь і схаваеш плоскі кацялочак за пазуху, бліжэй да цела. А там жа — цэлых трыццаць шэсць градусаў ды яшчэ колькі дзесятых! Цудоўна варыцца! Праўда, можа каму здасца цвердавата, недаварана. Пра густы, аднак, не спрачаюцца. Карацей, асабіста я цалкам задаволены той ежай, якая варыцца ў'маім кацялку. Гэта абсалютна нармальная ежа і харчавацца ёю я магу цэлымі месяцамі. Уявіце: цэлы месяц хадзіць па горных хрыбтах улегцы, не цягаючы лішняга.

У гарачыя дні лета і вы самі, напэўна, халаднік просіце. Чаму на холадзе вас да гарачага цягне? Бо вопратка халодная. Чалавек стварыў адзенне для выхаду ў адкрыты космас, але яшчэ не мае добрай вопраткі для выхаду ў адкрытае поле. Пабудзе там з паўдня, і ўжо вопратка яго адсырэла, халадзіць пачынае, бяжыць чалавек у хату, каб сагрэцца, пасёрбаць гарачага.

Мая вопратка заўсёды сухая і цёплая. Іменна таму, што няма ў ёй ні ваты, ні пуху, такім чынам, няма сырасці за што і ўчапіцца.

Ну, вось і ўсё. Але не. Яшчэ параю: не спяшайцеся пераймаць чужы вопыт, лепшы вопыт — гэта свой.

У. ГЕРАСІМАЎ,
бывалы турыст.








(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

**Вынік вы бачылі самі: адбыўся цудоўны вечар, выявіліся новыя таленты, многія паверылі ў сябе, у свае здольнасці. Вечар аб'яднаў і ўдзельнікаў, і гледачоў, кожнаму яшчэ бліжэйшым стаў родны факультэт.**

**Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.**

**НАТАТКІ З ГАЛЁРКІ**

# ...І круціцца «ваўчок»

**ВОЧЫ схаваны за чорнымі акулярамі, белыя пальчаткі бяссільна павіслі ў паветры... Чалавек-маланка глядзіць на нас з плаката і запрашае на першы рэспубліканскі фестываль брэйк-данса «Ваўчок-87».**

**У фае рэспубліканскага Палаца культуры прафтэхадукацыі шматлюдна. На спецыяльных пляцоўках ідзе барацьба паміж брэйк-дансістамі.**

**Кожны танец мае сваю мову. Брэйкер, ці робат ён, ці танцуе ў стылі «электрык-бугі», нязменна задае пытанне: «Ты зможаш, як я? Ану, паспрабуй!».**

**Фестываль пачынаецца ў фае нездарма. Тут кожны — удзельнік свята. Нават той, хто не выйдзе сёння на сцэну, можа выклікаць прызнанага брэйк-дансіста на танцавальную дуэль.**

**На фестывалі няма прайграўшых. ЦК ЛКСМБ і рэспубліканскі маладзёжны музычны цэнтр «Арыенцір» не ставілі перад сабой мэту — вызначыць лідэра. Было задумана паказаць беларускі брэйк-данс. І для рабят гэтае свята стала не толькі месцам цікавых сустрэч, але і школай майстэрства.**

**Добра выступалі Новаполацкая група «Красавік» і дуэт з Мінска «Вольны стыль». На апошнім канцэрце дуэт «распаўся» — адзін з яго членаў захварэў. І тады Ігар Муха выйшаў на сцэну адзін, на хаду імправізуючы новы танец. Зала гудзела: «Ігару — прыз за волю да перамогі!».**

**Цікавай была праграма дуэта «Пластылін» з Брэста. Спалучэнне эстраднага танца і «флэша» — танца на хвалях — выклікала незадаволенасць у прыхільнікаў «чыстага» брэйка. Аднак дэцыбелы шумамера нязменна рваліся на высокія лічбы і прыгожыя брэстчанкі сапраўды заваявалі залу. А таксама галоўны прыз вядучага. Рыгор Бульдзюсаў жартаваў, што «упершыню скарыстаў службовае становішча».**

**Танцор размаўляе з гледачом на мове ўмоўнасці. Мінская група «Дэльта» гэта добра ўсвядоміла. І паспрабавала аб'яднаць некалькі стыляў і танцаў у тэатралізаваны паказ. Перад намі паўстала гісторыя Краіны Саветаў на мове брэйка. Умоўнасць умоўнасцю, але яна ж выклікае розныя асацыяцыі! Калі на сцэну, крыўляючыся, выйшлі першыя калгасніцы — даяркі з вёдрамі ў руках — гэта было проста смешна. Але калі брэйкер у ахоўным касцюме паліў з цацачнага аўтамата па танцорах, якія выконвалі складaныя круцёлкі,— тут ужо было не да смеху. Ад такога спектакля панеслі страту і брэйк, і сцэнаграфія, а галоўнае — глядач. Убачыўшы на сцэне такую безгустоўнасць, ён, упэўнена, не атрымаў эстэтычнай асалоды.**

**Сапраўднымі настаўнікамі беларускіх брэйк-дансістаў сталі нашы госці з Рыжскага універсітэта — група пад кіраўніцтвам Уладзіміра Яблакава. Галавакружныя вяртушкі з апорай на руцэ, локці, плячах альбо лбе прымусілі залу прыйсці ў захапленне. Маланкападобны танец у стылі «локіні» выклікаў у заўзятых прыхільнікаў брэйка свіст, складаныя элементы суправаджаліся выбухам апладысментаў. Але сапраўды аднадушна аддалі гледачы свае сэрцы «робатам». Саша Каласоўскі, Андрэй Марцін, Ігар Самойлаў і Аляксей Кузьмін са скрупулёзнай дакладнасцю перадавалі адзін аднаму «зарад». Бурлівая зала замірала ў хвалюючай цішыні, імкнучыся не прапусціць ніводнага руху. І калі Лёша Кузьмін дакладна, без ніводнай памылачкі зняў, а потым апрануў пінжак — зала ўзарвалася радасным крыкам. Нехта заўважыў: «А гэта ж — мастацтва».**

**І сапраўды, магчыма, учарашні вулічны танец пакіне свой радок у гісторыі мастацтва. Бо і вальс, і танга нараджаліся не ў палацах і не на вялікіх сцэнах... А сёння мы называем гэтыя танцы класічнымі.**

**Т. ГУСЕВА,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

**ЗАБАВЕ — ЧАС**

# Выбірае глядач

БУРНАЕ развіццё атрымлівае відэа. Відэасалон, відэазалы, відэакафэ — гэтыя паняцці ўсё часцей паяўляюцца на старонках друку, пра іх гавораць і спрачаюцца.

У Мінску, на вуліцы Маскоўскай, 16 адкрыты штодзённа з 12.00 да 20.00 відэасалон, фонд якога налічвае больш 800 назваў самых разнастайных відэапраграм: савецкіх і замежных стужак, цыркавых, канцэртнапацяшальных праграм, тэатральных пастановак... Сюды можна прыйсці з сям'ёй, з сябрамі, сваёй студэнцкай групай і паглядзець у спрыяльны для вас час любую з праграм, папярэдне аформіўшы заказ. Працуюць і пункт пракату відэакасет, кабіны для індывідуальнага прагляду. Хачу заўважыць, што стужкі спачатку выходзяць на відэа, а потым ужо паяўляюцца на экранах кінатэатраў. Мяркуецца, што некаторыя фільмы, праграмы будуць прызначаны толькі для відэаэкрана. Кінастудыя «Масфільм» прапануе вашай увазе новую мастацкую стужку «Шантажыст». Прыхільнікаў мультыплікацыі чакаюць больш 40 зборнікаў вытворчасці розных краін. Творы сусветнага кіно, класіка, прыгодніцкі і камедыйныя жанры, фантастыка — да вашых паслуг.

Т. МІРОНАВА.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа

12 лістапада 1987 г.
Зак. 1594.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОЙ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара
З. А. АЛЯШКЕВІЧ.